# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі В.А. Мусіенкі «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў»

Праблемы намінацый сёння знаходзяцца пад пільнай увагай прадстаўнікоў розных навук. Гэта тлумачыцца выключнай складанасцю дадзенай моўнай з'явы, сутнасць якой заключаецца ў пошуку моўнага выражэння практычна бясконцай аб'ектыўнай рэчаіснсці. Асобную нішу сярод намінацый складаюць другасныя ментальныя намінацыі, дзе з дапамогай мовы апісваюцца элементы мыслення, розныя псіхічныя станы і працэсы, даследуецца рэпрэзентатыўнасць у мове сістэмы поглядаў, вераванняў, разумова-духоўных установак, інтарэсаў, уяўленняў, норм, ацэнак, настрояў асобнага чалавека ці супольнасці людзей. Феномен ментальнасці з'яўляецца важным і актуальным для яго аналізу з розных пазіцый і напрамкаў.

Даследаванне прысвечана даволі актуальнай тэме, звязанай з феноменам ментальнасці, які займае цэнтральнае месца ў нацыянальнай канцэптасферы любога этнасу. Дысертацыя з'яўляецца першым у беларускім мовазнаўстве супастаўляльным даследаваннем другасных ментальных намінацый, якое ілюструе нацыянальна-культурную спецыфіку беларускай і англійскай моў, а актывізацыя сучасных працэсаў глабалізацыі і міжмоўнай камунікацыі павышае актуальнасць дадзенага даследавання. Аб'ектам даследавання, як гэта бачна з аўтарэферата, з'яўляецца субстантыўная, ад'ектыўная і дзеяслоўная лексіка, у якой разглядаюцца яе колькасны і якасны склад, розныя класіфікацыі, асаблівасці функцыянавання і спецыфіка вербалізацыі ў беларускай і англійскай мовах.

У аўтарэфераце В.А. Мусіенка «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў» разглядаюцца субстантыўныя, ад'ектыўныя і дзеяслоўныя лексічныя адзінкі, у сэнсавых структурах якіх развіліся другасныя ЛСВ. Устанаўліваецца спецыфіка семантычнай рэпрэзентацыі другасных ментальных намінацый у разглядаемых мовах. У першай главе «Катэгорыя ментальнасці ў сучаснай навуковай парадыгме» аўтарам разгледжаны пытанні, звязаныя з феноменам ментальнасці. У другой главе «Субстантыўныя і ад'ектыўныя ментальныя намінацыі» аўтар выяўляе другасныя ментальныя ЛСВ у сэнсавых структурах субстатываў і ад'ектываў. У раздзеле «Субстантыўныя намінацыі» разглядаюцца другасныя ментальныя ЛСВ, утвораныя ад першасных ЛСВ субстантываў са значэннем жывёл і птушак, прадметаў быту, артэфактаў, прылад працы, вупражы, адзення, абутку, галаўных убораў, дрэў і інш. У раздзеле «Ад'ектыўныя намінацыі» аўтарам разглядаюцца прыметнікавыя ментальныя намінацыі, якія ў залежнасці ад характару ўздзеяння на чалавека, перадачы інфармацыі і спосабаў успрымання пачуццяў размяркоўваюцца па наступных групах: а) намінацыі візуальнага (зрокавага) успрымання (параметрычныя каларатыўныя,

люмінальныя); б) намінацыі аўдыльнага ўспрымання (гукавыя); в) намінацыі тактыльнага і кінестэтычнага ўспрымання (тэмпературныя, кансістэнтныя, вагавыя); г) намінацыі густаторнага ўспрымання (густаторныя); д) намінацыі альфакторнага ўспрымання (адарычныя). Такую разнастайнасць варыятыўных сродкаў і спосабаў другасных ментальных, якая вызначаецца цяжкасцю вывучэння з'явы ментальнасці, паспяхова аптымізуецца аўтарам пры сістэматызацыі матэрыялу. Найбольш дэталёвы і шматбаковы агляд другасных ментальных намінацый аўтар прыводзіць у групах намінацый фізічных уласцівасцей і станаў чалавека, намінацый фізічных якасцей і характарыстык прадметаў і рэчываў. У главе 3 «Дзеяслоўныя другасныя намінацыі» аўтар разглядае дзеяслоўныя адзінкі, першасная семантыка якіх арыентавана на выяўленне руху, канкрэтных фізічных дзеянняў і станаў, тэмпературных, люмінальных, тэмпаральных і іншых паказчыкаў, што выкарыстоўваюцца для выяўлення інтэлектуальных працэсаў і ментальна-псіхалагічных станаў чалавека.

Аўтарэфереат В.А. Мусіенкі характарызуецца доказнасцю і аргументаванасцю прыведзеных фактаў, яскравымі ілюстрацыйнымі матэрыяламі. Назіраецца паслядоўнасць у выкладанні матэрыялаў, лагічнасць і завершанасць выказаных думак. Аўтарская манера даследаванні прадэманстравала пільны і скрупулёзны падыход да матэрыялу, які дазволіў зрабіць пераканаўчыя вывады і заключэнні. Не назіраецца злоўжыванне тэрмінамі і спецыяльнымі паняццямі. Паслядоўна захоўваецца навуковы стыль. Пастаўленыя мэты і задачы суадносяцца з заключнымі вывадамі

Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца ў адукацыйным працэсе пры выкладанні беларускай і англійскай моў, агульнага мовазнаўства, тэорыі і практыкі перакладу, напісанні дыпломных, магістарскіх работ і кваліфікацыйных даследаванняў.

Змест дысертацыі, як гэта бачна з аўтарэферата, адпавядае галіне навукі (філалагічныя навукі) і спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства, па якой яна прадстаўлена да абароны. Усё сказанае вышэй дае падставы сцвярджаць, што аўтару дысертацыі «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў» В.А. Мусіенку можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата філалагічных навук.

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры рускай мовы БДУ С.У. Махонь

ПОДПИСЬ Махонь УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник управления
организационной работы и
документационного обеспечения
Н.Б. Черкасская
«07» 03 2022